# БЕЛАРУСЬ І ГЕРМАНІЯ Ў ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ ПРАСТОРЫ: МІНУЛАЕ, СУЧАСНАСЦЬ І ПЕРСПЕКТЫВЫ

**А. А. Павільч**

## КАМПАРАТЫЎНЫЯ ДАСЛЕДАВАННІ КУЛЬТУРЫ Ў НЯМЕЦКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XX ст.

Пачатак фундаментальнаму вывучэнню міжкультурных адрозненняў і выяўленню сістэмаўтваральных канстант культурных цэласнасцяў паклала нямецкая трансцэндэнтальная філасофія, у межах якой рэканструяваліся лагічныя пабудовы індывідуальных тыпаў культуры. Філасофскія і гісторыка-культурныя даследаванні XIX – пачатку XX ст. адрозніваліся адзінствам кампаратыўнага падыходу і прынцыпу цэласнасці, якія паслядоўна рэалізаваліся як у храналагічным, так і ў лакальным аспектах аналізу творчых дасягненняў розных народаў свету [1].

Вытокі аднаго з накірункаў параўнальных даследаванняў культуры – *цывілізацыйнай кампаратывістыкі* – звязваюцца з творчасцю нямецкага вучонага Освальда Шпенглера, які поруч з расійскім вучоным М. Я. Данілеўскім з’яўляўся прадстаўніком тэорыі цыклічнага развіцця культуры і цывілізацыі. Па меркаванні амерыканскага антраполага А. Л. Кробера, О. Шпенглер быў кампаратывістам у самым шырокім сэнсе і з усіх даследчыкаў, звязаных з параўнальным вывучэннем цывілізацый, бліжэй за ўсіх падышоў да праблем культурнай антрапалогіі, праявіўшы сябе ў якасці «абсалютна неэтнацэнтрычнага культурнага рэлятывіста» [2, с. 859]. Сам О. Шпенглер разглядаў параўнальнае даследаванне ў якасці стратэгічна важнага метадалагічнага прыёму гісторыка-культурных даследаванняў, але ў той жа час канстатаваў факт яго ігнаравання ў практыцы вывучэння асобных культур. Ён атаясамліваў сусветную гісторыю з няспынным развіццём вялікіх культур, кожная з якіх з’яўляецца жывой праявай сваёй душэўнай сутнасці, выражанай у сімвалічных формах, у якіх рэалізуецца гістарычны лёс і творчы патэнцыял народаў як «душэўных адзінстваў» [3, с. 214–215]. Такімі ж арганічнымі душэўнымі адзінствамі ўяўляліся аўтару гарады і вёскі, якія ў сваю чаргу «адрозніваюцца не памерамі, а наяўнасцю душы» [3, с. 114]. Адпаведна, аб’ектамі кампаратыўных назіранняў у даследаваннях О. Шпенглера сталі восем арыгінальных гісторыка-культурных цэласнасцей, галоўным крытэрыем адрознення якіх быў сімвалічны праобраз свету кожнай культуры, які адлюстроўваецца ва ўсіх сферах творчасці этнакультурнай супольнасці і надае ёй адметны характар.

Кампаратыўныя даследаванні О. Шпенглера вылучаюцца навуковым імкненнем зразумець кожную культуру як аўтаномнае ўтварэнне, у яе ўласных паняццях і тэрмінах, не спрабуючы выводзіць яе адметнасць з біялагічнай канстытуцыі ці спадчыннасці народаў, геаграфіі ці прыроднага

асяроддзя. Зварот да метафарычнай мовы аналогій забяспечыў пераканаўчасць шпенглераўскіх класіфікацый і ідэнтыфікацый гісторыка-культурных супольнасцей, аснову кожнай з якіх складаюць пэўныя фундаментальныя мадэлі. Па вызначэнні О. Шпенглера, «узаемаадносіны паміж культурамі дастаткова разнастайныя, ужо нават дзякуючы прасторавай і часавай дыстанцыі» [3, с. 48]. Пры гэтым уплыў адной цывілізацыі на іншую можа стаць спрыяльным на адносна вялікай адлегласці, у той час як культурнае ўздзеянне на нязначнай дыстанцыі можа ўяўляцца прыгнятальным для суседніх рэгіёнаў. О. Шпенглер таксама адрозніваў усе культуры па характары і моцы ўзаемаадносін: «заходнееўрапейская культура знаходзіцца ў пошуку кантактаў, а егіпецкая ўхіляецца ад іх, хоць і вымушана саступіць з трагічнымі для сябе наступствамі, у той час як антычная культура выкарыстоўвае вынікі культурных кантактаў без усялякай шкоды для сябе».

Аналіз кампаратыўнай канцэпцыі О. Шпенглера дазваляе заключыць, што яе стваральнік з'яўляецца не столькі гісторыкам культуры, колькі даследчыкам інтуітывісцкага кшталту, які выражае свае эмацыянальныя адносіны да крызісу і заняпаду культур. Па вызначэнні К. Апеля, для філасофскай думкі XIX – пачатку XX в. рэчаіснасць уяўлялася толькі ў дзвюх дынамічных формах – *фізічнага і псіхічнага*, і пераканаўчым пацвярджэннем таго з'яўляецца шпенглераўская ідэя душы культуры [4]. Падобная рэдукцыя сацыякультурнай рэчаіснасці да псіхафізічнай рэальнасці назіраецца ў тыпалогіі асобных культур і народаў, створанай прадстаўніком нямецкай некласічнай філасофіі Ф. Ніцшэ, які атаясамліваў узаемадзеянне паміж рознымі культурамі з фізіялагічнымі адносінамі мужчынскага і жаночага пачаткаў. На яго думку, першы з іх стварае жыццё культуры і закладвае яе падмурак (яўрэі, рымляне, немцы), а другі выношвае, фарміруе і даводзіць яго да дасканаласці (старажытныя грэкі і французы) [1, с. 13].

Аналіз гісторыка-культурных працэсаў на аснове іх цэласнага ўспрымання і кампаратыўнай метадалогіі атрымаў новае развіццё ў некласічным тлумачэнні сусветнай гісторыі культуры Карла Ясперса – прадстаўніка філасофіі рэлігійнага экзістэнцыялізму. Ён дапускаў магчымасць сапраўднага спасціжэння сусветнай гісторыі культуры толькі з глыбіні яе самой і знаходзіў сэнс гісторыі чалавецтва «толькі ў цэласнасці яе падзей і ў кожнай яе асаблівай і адзінкавай праяве» [5, с. 128]. К. Ясперс крытычна асэнсаваў традыцыйныя падыходы да гістарычнай тыпалогіі культур, звязваў дынаміку культуры з завершаным у сэнсавых адносінах працэсам *паміж вытокамі і мэтай* і распрацаваў арыгінальную тыпалогію культуры, заснаваную на ідэі *восевага часу*. Паняцце восевага часу звязваецца з новай духоўнай эрай у гісторыі сусветнай культуры, істотнымі адрозненнямі якой ад папярэдняй гісторыка-культурнай эпохі сталі крызіс міфалагічнай свядомасці, актывізацыя рэлігійна-філасофскіх вучэнняў, узнікненне і развіццё сусветных рэлігій. К. Ясперс станоўча ацаніў патэнцыял кампаратыўнай метадалогіі, надзяляючы параўнанне ў кагнітыўнай і рэфлексіўнай дзейнасці чалавека

здольнасцю дальнабачнага і выразнага ўспрымання мультыкультурнай рэальнасці. Ён адводзіў кампаратыўнаму падыходу першачарговую ролю ў дасягненні аб'ектыўных меркаванняў пра іншыя культуры.

Кампаратыўны аналіз розных тыпалагічных мадэляў культуры адлюстраваны ў творы «Еўропа і душа Усходу» нямецкага філосафа першай паловы XX ст. Вільгельма Шубарта. На аснове параўнання ментальных стэрэатыпаў, якія выяўляюцца ў гістарычных і сучасных рэаліях і фактах сацыякультурнай рэчаіснасці народаў Заходняй Еўропы і Расіі, В. Шубарт зрабіў высновы пра іх супрацьлегласць, вобразна атаясамліваючы іх з культурамі *сярэдзіны і канца* [6, с. 77]. Шляхі развіцця культуры аўтар звязваў з імкненнем да парадку і стану ўсеагульнай бяспекі «пасля пабеднага завяршэння барацьбы» [6, с. 76]. Характар дынамікі рускай культуры, надзеленай тонкім адчуваннем крызісаў і прагай да пераваротаў, дае падставу для выяўлення такой заканамернай тэндэнцыі, як гатоўнасць «прынесці сябе ў ахвяру ў працэсе сацыяльна-гістарычных катастроф». Адрозненні паміж абедзвюма культурнымі цэласнасцямі выяўляюцца таксама ў карэляцыі свецкага і рэлігійнага пачаткаў, паколькі «у культуры сярэдзіны рэлігія палітызуецца, а ў культуры канца рэлігійнай становіцца сама палітыка» [6, с. 78].

У сачыненні В. Шубарта асэнсоўваюцца відавочныя супрацьлегласці паміж заходняй і рускай праваслаўнай цывілізацыямі, даецца разгорнутая супастаўляльная характарыстыка рускага і заходняга складаў ментальнасці, каштоўнасных пераваг, стандартаў мыслення, тыповых спосабаў жыццядзейнасці: «Рускі чалавек не адчувае каштоўнасці эвалюцыі, устойлівасці культуры і т.д., але валодае даволі тонкім адчуваннем крызісаў. Ён больш любіць пераваротны, чым пераходны стан жыцця. Для заходняга ж чалавека, асабліва прускага ці англійскага складу, няма нічога больш нежаданага, чым пераварот і хаос. Ён у такой жа ступені пазбягае рэвалюцый, у якой рускі нясцерпна чакае іх. Рускага больш натхняе сітуацыя развалу, чым клопат пра захаванне традыцый. Еўрапейца цалкам задавальняе свет; ён у ім утульна абжываецца і моцна трымаецца за зямныя даброты; ён –рэаліст. Рэалістам ён толькі і можа быць, паколькі разышоўся з вечнасцю. Рускі ж мала шануе свет, трывала не прывязаны да яго, нішто не можа ўтрымаць яго надоўга» [6, с. 43–44].

Даследчык В. Шубарт вобразна атаясняў сучасную яму Еўропу з «формай без жыцця», а Расію называў «жыццём без формы» [6, с. 307]. У яго рэпрэзентацыі розных культур назіраюцца асуджальныя адносіны да заходняй цывілізацыі і адначасова адчуваецца яго праславянская прыхільнасць. «Англічанін глядзіць на свет, як на фабрыку, француз – як на салон, немец – як на казарму, рускі – як на храм <…> Англічанін чакае ад бліжняга карысці, француз імкнецца выклікаць сімпатыю, немец хоча ўладарыць, рускі нічога не хоча» [6, с. 308]. Побач з шырока распаўсюджанымі класіфікацыямі жаночых і мужчынскіх культур, ён вылучыў «культуры слова і культуры цішыні, культуры гаваркія і маўклівыя», маючы на ўвазе пад маўчаннем «спосаб сузірання» і звязваючы маўленне са «спосабам дзеяння». «За куль-

турай слова стаіць чалавек, прагны да ўлады, імкнучыся расчляніць ірацыянальнае, іншымі словамі – чалавек справы, прыцягнены да ўсяго зямнога. За культурай маўчання стаіць чалавек самаадданы, здольны да сузірання, накіраваны ў пошукі вечнасці» [6, с. 146].

Вучоны В. Шубарт таксама абгрунтаваў дэтэрмініcцкую канцэпцыю культуры, аснову якой складае ідэя змянення тыпалагічных рысаў і ментальных характарыстык гісторыка-культурных перыядаў у выніку змены эанічных архетыпаў, якія атаясамліваюцца з духам эпохі, што вызначае культурныя адрозненні часу. Гэта палажэнне дазволіла аўтару прыйсці да заключэння, што змена эпох «выключае магчымасць фарміравання ўстойлівых рысаў нацыянальнага характару» [6, с. 19], а асноўным фактарам, які абумоўлівае адрозненні ментальнасці народаў у адной часавай прасторы, з'яўляецца *дух ландшафту* (лац. *genius loci* 'дух мясцовасці').

Нямецкі даследчык першай паловы XX ст. Ганс Гюнтэр звязваў заняпад цывілізацый з працэсамі этнакультурнай міксацыі і з адпаведнай зменай статусаў тытульных этнасаў у гісторыі сусветнай культуры, што ў значнай ступені стымулявалася, на яго думку, палітыка-прававымі фактарамі. Ён лічыў, што заканадаўства Старажытнага Рыма значна паскорыла заняпад магутнай імперыі, стварыўшы спрыяльныя ўмовы для прадстаўнікоў гарадскіх нізоў афрыканскага і азіяцкага паходжання, якія толькі забяспечвалі прырост насельніцтва, ў дзяржаве, і пры гэтым многія з іх вызваляліся ад выплаты падаткаў [7, с. 104].

Такім чынам, кампаратыўныя даследаванні ў нямецкай гістарыяграфіі першай паловы XX ст. былі накіраваны на сістэмнае ўспрыманне, катэгарыяльны аналіз і тыпалагізацыю культурнай разнастайнасці і тым самым заклалі фундаментальны падмурак для далейшага вывучэння міжкультурных адрозненняў. Фундаментальныя даследаванні міжкультурных адрозненняў былі ў значнай ступені накіраваны на праблемныя сферы культуралогіі і антрапалогіі і адрозніваліся інтэграцыяй філасофскага асэнсавання і тэарэтычнай рэфлексіі культурнай разнастайнасці. Кампаратыўныя пошукі азначанага гісторыка-культурнага перыяду таксама прадугледжвалі выяўленне заканамернасцей культурнай дынамікі і анталагічнай сутнасці культурнай разнастайнасці, распрацоўку тыпалогіі культур на аснове ўстанаўлення сістэматычнага падабенства і ўстойлівых міжкультурных адрозненняў.

## ЛІТАРАТУРА


1. *Павильч, А. А.* Компаративные исследования культурного разнообразия: методологический опыт и коммуникативная проекция / А. А. Павильч. – Минск : МГЛУ, 2017. – 168 с.

2. *Крёбер, А. Л.* Избранное: Природа культуры / А. Л. Крёбер ; пер. с англ. – М. : РОССПЭН, 2004. – 1008 с.

3. *Шпенглер, О.* Закат Европы: Очерки морфологии мировой истории : в 2 т. / О. Шпенглер ; пер. с нем. С. Э. Борич. – Минск : Попурри, 1999. – Т. 2 : Всемирно-исторические перспективы. – 720 с.

4. *Апель, К. О.* Трансформация философии / К.О. Апель ; пер. с нем. В. Куренной [и др.]. – М. : Логос, 2001. – 344 с.
5. *Ясперс, К.* Всемирная история философии. Введение / К. Ясперс. – СПб. : Наука, 2000. – 272 с.
6. *Шубарт, В.* Европа и душа Востока / В. Шубарт ; пер. с нем. З. Г. Антипенко, М. В. Назарова. – 2-е изд. – М. : Альманах «Рус. идея», 2000. – 448 с.
7. *Гюнтер, Р.* История культуры / Р. Гюнтер. – СПб. : Издание А. С. Суворина, 1901. – 352 с.

**А. М. Кушнярэвіч**

## РОЛЯ НЯМЕЦКАГА АРХІТЭКТАРА Я. С. БЭКЕРА Ў РАЗВІЦЦІ БАРОЧНА-КЛАСІЦЫСТЫЧНАЙ СТЫЛІСТЫКІ БЕЛАРУСКАГА ДОЙЛІДСТВА

Найбольш раннія праявы класіцызма ў архітэктуры беларускіх земляў супадаюць з эпохай Асветніцтва, ахопліваюць першыя два яе дзесяцігоддзі і звязаны са стылістыкай барочнага класіцызма. Яго распаўсюджванне ў дойлідстве беларускіх земляў, як і ў цэлым Рэчы Паспалітай, пераважна ініцыіравалася заказамі сацыяльнай эліты, сярод якой значнае месца займалі архітэктурна-будаўнічыя задумы прадстаўнікаў каралеўскага двара. Аднак на беларускіх землях з пачатку 1760-х гадоў рысы класіцызма праявіліся не ў дынастычным будаўніцтве, а ва ўладаннях канцлера Вялікага Княства Літоўскага (далей ВКЛ) Аляксандра Міхаіла Сапегі, які належыў да старажытнага магнацкага роду, прадстаўнікі якога былі не толькі буйнымі землеўладальнікамі, але і займалі ў згаданай дзяржаве розныя вышэйшыя пасады [1, с. 24]. Росквіт роду Сапегаў прыйшоўся на XVI–XVII стст., калі па свайму палітычнаму становішчу і памерах багацця яны ўступалі толькі Радзівілам [2, с. 545–546]. Эпоха Асветніцтва як бы надала другое дыханне дзейнасці прадстаўнікоў гэтага старажытнага рода. Пад уплывам новых ідэй Сапегі пачалі абшырнае будаўніцтва ў сваіх беларускіх уладаннях, якое па размаху, мастацкаму ўзроўню і глыбіні выражаемых мастацкіх ідэй адпавядала каралеўскаму. У гэтым будаўніцтве ідэі Асветніцтва зліліся з імкненнем уваскрэсіць былую славу Сапегаў, адрадзіць іх радавую рэзідэнцыю, заснаваную самым славутым прадстаўніком роду – канцлерам ВКЛ Львом Сапегам. Архітэктурна-будаўнічыя задумы дапамог рэалізаваць А. Сапегу дойлід нямецкага паходжання Ян Самуэль Бэкер. Яго архітэктурная спадчына – найбольш значная сярод вядомых творцаў XVIII ст. (Л. Гуцэвіч, М. Кнакфус, К. Скампані, Я. Падчашынскі, Л. Лутніцкі, Дж. Сакко і інш.), якія працавалі на Беларусі [1, с. 24–25].

Архітэктар Я. С. Бэкер нарадзіўся і вучыўся архітэктуры ў Саксоніі, прыехаў у ВКЛ у канцы 50–пачатку 60-х гг. XVIII ст. ва ўзросце каля 25–30 гадоў.